# Весці БДПУ

**Навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2(60) 2009**

**СЕРЫЯ 1.**
**Педагогіка. Псіхалогія.**
**Філалогія**

## Змест

***Галоўны рэдактар:***
**П.Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

А.І. Андарала
*(нам. галоўнага рэдактара)*

Н.Г. Алоўнікава

С.Я. Гайдукевіч

К.У. Гаўрылавец

А.А. Гіруцкі

Я.Л. Каламінскі

Л.А. Кандыбовіч

В.А. Капранава

П.А. Міхайлаў

В.Дз. Старычонак

Г.В. Торхава

Л.Н. Ціханаў

І.І. Цыркун

***Слова рэдактара .......... 3***

***Педагогіка***

*Евдокимова Е.Л.* О некоторых аспектах организации управляемой самостоятельной работы при изучении иностранных языков .......... 4

*Никитенок Н.А.* Методы художественно-творческой деятельности: классификация и характеристика .......... 6

*Михаленко Н.Д.* Особенности физического воспитания учащихся начальной школы Беларуси (конец XIX – начало XX в.) .......... 12

*Лазаревич О.В.* Развитие логического мышления учащихся младших классов как психолого-педагогическая проблема .......... 15

*Науменко О.А.* Символизм детской игры как средство социализации дошкольника .......... 19

***Псіхалогія***

*Березовская Т.П.* Интегральные критерии развития творческого потенциала госслужащих и их показатели: акмеологический подход .......... 24

*Марач А.В.* Художественный стиль как содержательное обобщение в структуре ментального опыта субъекта музыкальной коммуникации .......... 28

*Исакова Т.А.* Теоретические аспекты формирования жизненных и профессиональных планов личности детей-сирот .......... 32

*Качалка А.В.* Феномен псіхалагічнай гатоўнасці да прафесійнай дзейнасці .......... 35

***Філалогія***

***Мовазнаўства***

*Соловьева Н.В.* Устойчивые неоднословные наименования продуктов питания и напитков в русском языке XI–XVII вв.: лингвогносеологический аспект .......... 39

Радзіваноўская Н.А. Простыя айконімы, суадносныя з назвамі расліннага свету, у форме множнага ліку .......... 44

*Папко Н.Ю.* Антропонимы в русском переводе повести А.К. Дойла «Знак четырех» .......... 47

*Абрамова Е.И., Фомина В.С.* О некоторых приемах экспрессивации художественного текста (на материале романа-фэнтези М. Успенского «Там, где нас нет») .......... 51

*Бобровская Е.О.* Модальность как отражение женской позиции (на материале художественной прозы В. Токаревой) ........ 56

*Чернышева Л.В.* Оценка и ценности в русской паремиологии ........ 59

*Елисеева И.С.* Заимствования-неологизмы в структуре современного русского газетного текста ........ 63

*Томчык Д.С.* З гісторыі вывучэння этыкетных формаў зносін ........ 67

## *Літаратуразнаўства*

*Данилович Т.В.* Рецепция Чернышевского в романе В. Набокова «Дар» ........ 71

*Артамонов Г.А.* Литературный герой Стивена Кинга ........ 76

*Бацюлёва Ю.Р.* Догмат Святой Троіцы ў «Жэнеўскім катэхізісе» Ж. Кальвіна і «Катэхізісе» 1562 г. С. Буднага ........ 80

*Бабчанок М.А.* Трансфармацыя беларускай аказіянальнай абраднасці ........ 86

*Ядловская А.В.* Экзистенциалистские мотивы в творчестве Дино Буццати ........ 90

*Дрыгін А.В.* Беларускія народныя гульні: новыя падыходы да класіфікацыі ........ 93

*Бояркина И.О.* О некоторых художественных особенностях романов Г. Джеймса «Бостонцы» и Э. Уортон «Век невинности» ........ 97

***Рэцэнзіі*** ........ **102**

***Нашы юбіляры*** ........ **105**

***Рэфераты*** ........ **106**

***Адрас рэдакцыі:***
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12
*e-mail:* vesti@bspu.unibel.by

Пасведчанне № 2287
ад 08.02.05 г.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 22.06.09.
Фармат 60×84 1/8.
Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*.
Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 12,79.
Ул.-выд. арк. 13,72.
Тыраж 110 экз.
Заказ 292.

*Выдавец*
*і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка».
Ліцэнзія № 02330/0494368
ад 16.03.09.
Ліцэнзія № 02330/0494171
ад 03.04.09.
220050, Мінск, Савецкая, 18.

*Якасць ілюстрацый адпавядае*
*якасці прадстаўленых*
*у рэдакцыю арыгіналаў*

*Адказны сакратар*
В.П. Андрыевіч

*Рэдактар*
В.П. Андрыевіч

*Тэхнічнае рэдагаванне*
А.А. Пакалы

*Камп'ютэрная вёрстка*
Д.В. Вярбіцкай

© Весці БДПУ. Серыя 1.
2009. № 2.

Бога-Сына з'яўляецца часткова перакладной і часткова арыгінальнай. Што датычыцца разгляду С. Будным асобы Святога Духа, то гэта частка ў адносінах да «Жэнеўскага катэхізіса» з'яўляецца арыгінальнай.


ЛІТАРАТУРА

1. *Будны, С.* Катихисіс, то ест Наука стародавная хрістіаньская от Светого Писма для простых людей языка руского въ пытаніах и отказъх събрана / С. Будны. – Нясвіж, 1562. – 261 ар.
2. *Корзо, М.А.* Украинская и белорусская катехетическая традиция конца XVI–XVIII вв.: становление, эволюция и проблемы заимствований / М.А. Корзо. – М.: Канон+, 2007. – 671 с.
3. *Лихачев, Д.С.* Текстология: На материале рус. лит. X–XVII вв. / Д.С. Лихачев, при участии А.А. Алексеева и А.Г. Боброва. – СПб.: Алетейя, 2001. – 758 с.
4. *Саверчанка, І.В.* Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар / І.В. Саверчанка. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – 224 с.
5. *Bogner, M.* Catéchismes de Calvin / M. Bogner. – Pamiers, 1905. – 97 p.
6. *Budny, S.* Biblia. Ksiegi Starego Przymierza / S. Budny // Biblia Slavica II 3. Bd. 1. – Факсімільнае выданне Nieswiez, Zaslaw, 1571–1572. – Ferdinand Schöningh: Padeborn – München – Wien – Zürich, 1994. – 1206 S.
7. *Calvin, J.* Le catéchisme de l'église de Genève / J. Calvin // Confessions et catéchismes de la foi réformée / Sous la direction d'Olivier Fatio. – Genève: Labor et Fides, 2005. – P. 25–105.
8. *Dhotel, J.-C.* Les origines du cathéchisme moderne. D'après les premiers manuels imprimés en France / J.-C. Dhotel. – Paris, 1967. – P. 456.



SUMMARY

*This article contains an attempt to perform an attributive textual analysis of S. Budny's «Catechism» (1562). With the purpose of clarification if the Belarusian «Catechism» is an original work or a translation, there is a comparison of a French edition of Calvin's «Geneva Catechism» and S. Budny's «Catechism», performed upon the example of the analysis of the Doctrine of Holy Trinity in both catechisms. The results of the comparative analysis are represented as tables. The excerpts of text analyzed are quoted in original. The excerpts of French text have been translated into Belarusian language.*


---

*УДК 394.3*

***М.А. Бабчанок,** выкладчык кафедры этналогіі і фальклярыстыкі БДПУ*

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ АКАЗІЯНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

Аказіянальная абраднасць адносіцца да адной з найменш вывучаных сфер беларускай народнай культуры. Аднак аказіянальны абрад можа ўтрымліваць у сабе элементы разнастайных па відзе абрадаў і звычаяў, паколькі любое абрадавае дзеянне або тэкст у сваім першапачатковым выглядзе былі аказіянальнымі. Прычынай з'яўлення кожнага абраду была пэўная сітуацыя («аказія»), якая патрабавала ад чалавека пэўных дзеянняў у накірунку яе змянення ў пазітыўны бок. Даследчыца Г. Любімава вызначае, што развіццё традыцыйнай абраднасці «ішло ад аказіянальнага абраду да каляндарнага; ад абраду, выкліканага неабходнасцю, да абраду прэвентыўнага, які папярэджвае; ад абраду, які тэмпаральна (часова) не замацаваны, да абраду, замацаванага ў часовых адносінах, гэта значыць, каляндарнага» [6].

Першыя абрадавыя дзеянні і тэксты былі абумоўлены ўзнікненнем сітуацыі, якая не задавальняла патрабаванні чалавека або была крыніцай негатыўных пачуццяў (страх, боль і г. д.). Неабходнасць змянення такой сітуацыі вызначанымі не бытавымі метадамі і спосабамі і выклікала з'яўленне аказіянальных абрадаў і рытуальных дзеянняў, што датычыліся ўсіх сфер жыцця чалавека. Кожны рытуал можна разглядаць «як пераўтварэнне нейкай крызіснай сітуацыі ў новую, аптымальную для існавання дадзенага калектыву, пры дапамозе серыі кантактаў паміж «сваім» і «чужым» [1, с. 148]. Правядзенне рытуальных дзеянняў садзейнічала ўзнаўленню парушаных сувязей і адначасова наладжванню новых.

Паступова выдзяляюцца абрады, звязаныя з працоўнай дзейнасцю чалавека, – каляндарныя і спецыялізаваныя абрады. Каляндарная абраднасць з'яўляецца ў выніку доўгачасовага назірання чалавека за з'явамі прыроды, надвор'ем, асаблівасцямі расліннага і жывёльнага свету і г. д. Спецыялізаваныя абрады характарызуюцца сваёй прымеркаванасцю да пэўных неземляробчых заняткаў. Яны таксама звязаны з працоўным вопытам чалавека, аднак іх вылучэнне абумоўлена неабходнасцю забеспячэння ўдалай працы па пэўнай спецыяльнасці.

Усе вытворчыя (або працоўныя) абрады аб'ядноўвае не толькі іх сувязь з працай чалавека, аднак і тое, што прычынай з'яўлення такіх абрадаў стала крызісная сітуацыя, якая патрабавала змянення і была звязана з пэўным заняткам чалавека па забеспячэнні першых жыццёвых неабходнасцей.

Вялікую частку жыцця чалавека займала сямейна-бытавая сфера, дзе таксама існавала магчымасць узнікнення сітуацый, якія не задавальнялі чалавека. Для забеспячэння ўдалага сямейнага жыцця чалавека з'яўляліся і ўдасканальваліся абрады і рытуалы, прымеркаваныя да ўсіх стадый яго быцця ад нараджэння да смерці. Першапрычынай узнікнення сямейна-бытавой абраднасці магла быць сітуацыя ў сямейным жыцці чалавека, якая стала для яго небяспечнай або непрыемнай і патрабавала змянення ці нейкага ўздзеяння на яе пэўнымі сродкамі.

Такім чынам, элементы аказіянальнай абраднасці могуць знаходзіцца як у працоўных, так і ў сямейных абрадах, паколькі штуршком да іх з'яўлення магла быць пэўная крытычная сітуацыя, якая патрабавала змянення, у выніку чаго чалавек наладжваў звыклы лад жыцця і мог спадзявацца на абыходжанне такіх сітуацый у будучым. Кожны абрад у сваім пачатку можна аднесці да аказіянальнага, паколькі на яго з'яўленне ўздзейнічала крытычная (для таго канкрэтнага часу) сітуацыя. У сваім развіцці абрад часам губляе сваю прымеркаванасць да першапрычыны (да той сітуацыі, якая выклікала яго з'яўленне) і праводзіцца з нагоды папярэджання такой сітуацыі.

Значнымі асаблівасцямі выдзяляюцца абрады, непасрэдна звязаныя з прычынай свайго з'яўлення і правядзення. Такія абрады ахоплівалі тыя сферы жыцця чалавека, што знаходзіліся не пад уладай чалавека і якія ён не мог змяніць або нейкім чынам уздзейнічаць на іх. Гэтыя сферы жыцця датычацца прыродных, бытавых з'яў і здароўя чалавека. Паколькі пры ўзнікненні крызісу змяненне гэтых сфер для чалавека было недасягальным, то для гэтых мэт з'явіліся аказіянальныя абрады, закліканыя ўздзейнічаць на крытычную сітуацыю магічнымі сродкамі. Аказіянальны абрад уяўляе сабой сінтэз магічных дзеянняў, тэкстаў, сімвалаў, матэрыяльных рэчаў, якія толькі ў пэўны момант і толькі ў сваім адзінстве могуць дасягнуць выканання сакральнай функцыі. Асноўнай задачай аказіянальных абрадаў з'яўляецца непасрэднае магічнае ўздзеянне на прыродныя і ўвогуле жыццёвыя працэсы. Прычына ўзнікнення крызісу ў гэтых сферах ва ўяўленнях людзей звязана з магчымасцю пранікнення ў свет людзей сіл «чужых», таму, паводле меркавання А. Байбурына, аказіянальны абрад павінен будавацца наступным чынам: «Па-першае, неабходна выявіць тое ўвасабленне "чужога", якое прынесла з сабою няшчасце, і выкінуць яго за межы свайго свету. Па-другое, неабходна аднавіць і ўзмацніць мяжу паміж сваім і чужым» [1, с. 148].

Значныя змяненні аказіянальных абрадаў адбыліся падчас прыходу хрысціянства. З аднаго боку, працэс хрысціянізацыі садзейнічаў узбагачэнню і ўдасканаленню аказіянальнай абраднасці, з другога – знішчэнню многіх архаічных элементаў. Хрысціянства замяніла шматлікія язычніцкія абрадавыя дзеянні на больш гуманныя (напрыклад, рытуал ахвяравання жывых істот на сімвалічнае прынясенне штучнай ахвяры), у абрадавых дзеяннях з'явіліся царкоўныя атрыбуты і сімволіка. Значным момантам стаў непасрэдны ўдзел святароў у правядзенні аказіянальных абрадаў. Часам спосаб і магічны сэнс абраду заставаўся нязменным (архаічным), аднак спосаб правядзення і выкарыстаныя абрадавыя атрыбуты былі абумоўлены хрысціянскай традыцыяй.

Важнай асаблівасцю развіцця аказіянальных абрадаў з'яўляецца некаторае спрашчэнне кананічнасці абрадавых элементаў. У большай ступені гэта датычыцца выбару ўдзельнікаў абраду. Калі ў сваім архаічным варыянце звычай патрабаваў «рытуальную чысціню» ад удзельнікаў абраду, што абумоўлівала строгі адбор маладых дзяўчат (цнатлівых) і ў некаторых абрадах старых жанчын, то пазней «дадзены прынцып быў дапоўнены сацыяльнымі прыкметамі, што дазволіла ўключаць у лік удзельніц абраду ўдоў, салдатак і іншых катэгорый жанчын» [6], а таксама маладых хлопцаў.

Аказіянальныя абрады цесна звязаны з аграрна-каляндарнымі і сямейна-бытавымі звычаямі, яны даволі часта пераплятаюцца, узаемапранікаюць і дапаўняюць адзін аднаго. Прыкладам гэтага можа быць правядзенне некаторых аказіянальных абрадаў па абету, «кожны год у памяць пазбаўлення ад няшчасця» [1, с. 19]. Гэтыя працэсы маглі адбывацца і ў накірунку ўзаемапранікнення аказіянальных і сямейна-бытавых абрадаў, калі ўзнікалі крызісныя сітуацыі, якія датычыліся асабістага жыцця. Існавала і адваротная сувязь. Каляндарныя або сямейна-бытавыя абрадавыя дзеянні ў працэсе свайго гістарычнага развіцця маглі набываць сітуацыйны характар і выконвацца толькі пры ўзнікненні пэўнай неабходнасці.

З прыходам савецкай улады і арганізацыяй калгасаў правядзенне аказіянальных абрадаў, як і іншых відаў абраднасці, фактычна стала немагчымым, паколькі катэгарычна забаранялася. Часткова гэта адбывалася па прычыне правядзення дзяржаўнай антырэлігійнай палітыкі. У гэты час вырашэнне крызісных сітуацый было звязана ў большай ступені з канкрэтнымі практычнымі дзеяннямі. У сувязі з барацьбой савецкай ідэалогіі з рознага роду забабонамі і вераваннямі магічны аспект гэтых дзеянняў нават не разглядаўся. Такім чынам, да 70–80-х гадоў XX стагоддзя аказіянальная абраднасць была часткова згублена ў сялянскім асяродку, маладое пакаленне гэтага часу не ведала такіх абра-

даў, а старэйшае паступова забыла тыя звычаі і нормы, якія калісьці рэгулявалі жыццё. Аднак абсалютна знішчыць тыя ўяўленні, што стагоддзямі хвалявалі людзей, немагчыма, і некаторая частка абрадавага комплексу беларусаў засталася ў памяці народа. Традыцыйныя спосабы абароны ад пажару, навальніцы, буры і іншых катаклізмаў тайна выкарыстоўваліся і перадаваліся вусным шляхам ад пакалення да пакалення.

Такім чынам, беларуская аказіянальная абраднасць у працэсе свайго існавання даволі часта падвяргалася трансфармацыйным працэсам. У залежнасці ад вядучых фактараў, якія ўплывалі на яе істотнае змяненне, можна выдзеліць некалькі прычын трансфармацыі аказіянальных абрадаў:

- *рэлігійныя* – былі звязаны са зменамі ў рэлігійных уяўленнях чалавека, якія эвалюцыяніравалі ў гістарычным развіцці ад першапачатковых форм (пакланення прыродзе, татэмізму, фетышызму, анімізму) да сучасных сусветных рэлігій і неакультаў. Відавочна, што самым уплывовым фактарам на трансфармацыю беларускай аказіянальнай абраднасці стаў прыход хрысціянства і паступовае пранікненне ў абрадавую сферу хрысціянскіх царкоўных тэкстаў і атрыбутаў. Гэты працэс быў звязаны з трансфармацыяй не толькі кампанентаў аказіянальнай абраднасці, але ў першую чаргу рэлігійнай свядомасці, якая з'яўляецца духоўным «падмуркам» абрадавага комплексу;
- *сацыяльна-палітычныя* – уяўляюць сабой тэндэнцыі развіцця і ўдасканалення дзяржавы і грамадства, што мае значны ўплыў і на духоўную сферу. Гэтыя працэсы звязаны з істотнымі змяненнямі беларускай абраднасці ў сувязі з яе прыстасаваннем да новых сацыяльных і палітычных умоў. Важнымі прычынамі трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў былі працэсы урбанізацыі, змены ўлады (напрыклад, прыход савецкай улады), правядзенне дзяржаўнай палітыкі супраць народнай культуры і інш;
- *навуковыя дасягненні* – звязаны са значным уплывам навуковага прагрэсу на духоўнае жыццё людзей. Пашырэнне навуковых ведаў пра прыроду, жывы і нежывы свет садзейнічала істотным зменам ва ўяўленнях чалавека аб навакольным асяроддзі, што мела адмоўны ўплыў на магічныя ўяўленні людзей. Распаўсюджванне навуковых звестак пра з'явы прыроды, анатомію чалавека і іншыя працэсы пацягнула за сабою значныя змены ў агульным кругаглядзе людзей. Пры гэтым вера ў магічныя магчымасці аказіянальнай абраднасці істотна страцілася, працэс змянення абрадаў можна вытлумачыць іх прыстасаваннем да новых умоў. Вынікам такой трасфармацыі стаў пераход элементаў аказіянальных абрадаў у новыя фальклорныя формы.

Трансфармацыя аказіянальнай абраднасці ўяўляе сабой заканамерны працэс, звязаны са зменамі жыццёвых абставін людзей. У залежнасці ад гэтага можна вызначыць некалькі асноўных напрамкаў істотнага змянення аказіянальных абрадаў пад уплывам вышэйназваных прычын.

*Змяненне атрыбутыўнага апарату*. Гэты напрамак уключае ў сябе трансфармацыйныя працэсы, што датычацца матэрыяльных рэчаў і жывых істот, якія выкарыстоўваліся ў аказіянальным абрадзе. Змяненні колькасных і якасных характарыстык абрадавых атрыбутаў выяўляліся ў тым, што некаторыя з іх у працэсе бытавання абраду гублялі сваё значэнне і замяняліся новымі, больш дасканалымі атрыбутамі, якія адпавядалі новым жыццёвым умовам. Самае значнае змяненне рытуальных атрыбутаў было звязана з уключэннем у правядзенне аказіянальных абрадаў хрысціянскай сімволікі.

*Змяненне функцыянальнай накіраванасці*. Развіццё навукі і тэхнікі, а таксама і рэлігіі мае значны ўплыў на змяненне светапогляду чалавека, што выяўляецца перш за ўсё ў пашырэнні ведаў пра навакольны свет. Гэтыя працэсы звязаны са значным памяншэннем веры чалавека ў магію, у незвычайныя магчымасці некаторых людзей і прадметаў і г. д. Усё гэта садзейнічала змяненню або нават, у некаторых выпадках, і знішчэнню магічнай функцыі аказіянальных абрадаў. Прыкладам можна назваць змяненне рэлігійных уяўленняў пры пераходзе ад язычніцтва да хрысціянства, якое мела значны ўплыў на трансфармацыю семантыкі аказіянальнага абраду.

*Узмацненне драматызацыі*. Адным з магчымых сродкаў магічнага ўздзеяння аказіянальнай абраднасці было рытуальнае прайграванне станоўчага вырашэння крытычнай сітуацыі. Яно выяўлялася ў сімвалічных дзеяннях і тэкстах, якія адлюстроўвалі жадаемы вынік. Напрыклад, падчас засухі: «вечарам, пасля заходу сонца, дзеўкі і маладзіцы збіраюцца да купы, гамоняць, крычаць, а потым ідуць у поле, бегаюць там з крыкам, …а потым варочаюцца дамоў, паўкрыўшыся хвартухамі, нібыта йдзе дождж. Кажуць, што тагды не хібіць пайсці вялікі дождж» [7, с. 65]. У ходзе гістарычнага развіцця ў аказіянальных абрадах усё больш пашыраўся відовішчны кампанент, які ўтрымліваў тэатралізацыю, пэўную сімвалічнасць абрадавага дзеяння. Рытуальныя ахвяры ў выглядзе жывых істот замяняліся сімвалічнымі прадметамі, аднак пры гэтым заставалася нязменным правядзенне пахавальнага

абраду ахвяры, што ў дадзеным выпадку мела сімвалічны характар і з’яўлялася пэўным «тэатральным дзеяннем».

*Змена сферы бытавання.* Памяншэнне значнасці абрадавага комплексу ў жыцці чалавека садзейнічала трансфармацыйным працэсам, якія датычыліся ўсіх фальклорных жанраў. Змяненне функцый абрадавых дзеянняў і тэкстаў прывяло да пераходу адных фальклорных жанраў у іншыя. Многія аказіянальныя абрады, якія згубілі сваю магічную накіраванасць, трансфармаваліся ў іншыя фальклорныя формы. Некаторыя элементы або матывы аказіянальных абрадаў можна сустрэць у песнях, прыказках і прымаўках, рэшткі аказіянальных дзеянняў і тэкстаў, якія змянілі сваю функцыянальную накіраванасць, можна знайсці ў народных прыкметах і павер’ях. У большай ступені гэта датычыцца абрадаў выклікання дажджу, тэксты якіх захаваліся ў значна змененым выглядзе ў дзіцячых прыпеўках, прыгаворах і г. д.

Такім чынам, названыя накірункі трансфармацыі беларускай аказіянальнай абраднасці звязаны паміж сабой. Змяненне адных абрадавых элементаў выклікала пераўтварэнне іншых, таму нельга казаць, што гэтыя працэсы адбываліся адасоблена. Самая істотная трансфармацыя аказіянальнай абраднасці была звязана са зменамі рэлігійнай свядомасці чалавека, паколькі менавіта ўяўленні чалавека з’яўляліся асновай для фарміравання аказіянальнай абраднасці. Самым дзейсным фактарам стаў прыход хрысціянства на тэрыторыі Беларусі, гэты працэс быў абумоўлены зменамі ва ўяўленнях людзей пра свет («свой» і «іншы»), пра самога чалавека і яго жыццё, што мела значны ўплыў на трансфармацыю абрадавых атрыбутаў, тэкстаў, спосабаў правядзення, на змяненне крытэрыяў выбару ўдзельнікаў і месца выканання абрадаў і інш.

На жаль, некаторыя гістарычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, садзейнічалі знішчэнню многіх элементаў нацыянальнай культуры. Беларускі абрадавы комплекс цярпеў адмоўнае ўздзеянне не адзін раз. Гэта было звязана з разнастайнымі палітычнымі і сацыяльнымі працэсамі: са знішчэннем язычніцкіх вераванняў, з абмежаваннем і забаронай рэлігіі і царквы ў савецкі час, з дэмакратызацыяй духоўнага жыцця і талерантнымі адносінамі да прадстаўнікоў іншых сусветных рэлігій і неакультаў і г. д.

На сённяшні дзень нельга казаць пра магчымасці бытавання аказіянальнай абраданасці ў поўным выглядзе. Аднак некаторыя абрадавыя элементы захаваліся і ў наш час. Многія гаспадыні захоўваюць на выпадак узнікнення крытычнай сітуацыі такія сімвалічныя прадметы, як велікодныя яйкі, грамнічныя свечкі, зёлкі, асвячоную ваду і іншыя. Самыя трывалыя элементы аказіянальнай абраднасці захаваліся ў народнай памяці ў выглядзе прыкмет, прыгавораў, песень, прыпевак. Асобныя часткі абрадаў працягваюць сваё развіццё ў трансфармаваным выглядзе. Большая колькасць аказіянальных абрадавых элементаў знайшла сваё развіццё ў рэлігійных вераваннях і звычаях. Некаторыя атрыбуты і тэксты, якія з’явіліся ў складзе аказіянальных абрадаў з прыходам хрысціянства, і ў сучасны момант закліканы выконваць зберагальныя і ачышчальныя функцыі ў выпадках узнікнення крытычнай сітуацыі.

Частка аказіянальных абрадаў трансфармаваліся ў дзіцячыя фальклорныя творы, такія, як песні, гульні, заклічкі і іншыя жанры. У дзіцячых заклічках і прыгаворках ёсць нямала падобных твораў з архаічнымі зачынамі: «Дожджык, дожджык, секані ...», «Ідзі, ідзі, дожджыку, зварым табе боршчыку. Паставім пад лаўкаю, накрыем булаўкаю!» [4, с. 434], «Дожджык, дожджык, крапані: бабу з поля прагані» [5, с. 360]. Выкарыстанне сімвалічнага звяртання да воднай стыхіі з мальбой пра змяненне крытычнай сітуацыі – засухі – дазваляе зрабіць паралель дадзеных твораў з аказіянальнымі абрадамі выклікання дажджу, у якіх таксама прымалі ўдзел дзеці, спяваючы падобныя песні пры выкананні абрадавых дзеянняў. У дзіцячых песнях даволі пашыраны матыў звароту да стыхійных сіл прыроды, такіх, як дождж, сонца, месяц, вецер.

Дзіцячыя фальклорныя жанры змяшчаюць у сабе некаторыя элементы і матывы аказіянальнай абраднасці, звязаныя, у асноўным, са з’явамі надвор’я. У гэтым існуе пэўная сувязь з удзелам дзяцей менавіта ў такіх абрадах, у адрозненне ад іншых відаў аказіянальнай абраднасці. Дзеці выконвалі некаторыя дапаможныя дзеянні пры выкананні абрадаў выклікання дажджу, а ў некаторых выпадках праводзілі рытуалы самастойна. Прыкладам гэтаму можа быць «палескі звычай аплаквання і пахавання жабы, які спраўляюць дзеці падчас засухі» [10, с. 112]. Магічныя тэксты такіх абрадаў з цягам часу змяніліся, згубілі свае сакральныя функцыі і набылі забаўляльны кампанент, паступова пераўвасобіліся ў дзіцячыя прыгаворы і прыпеўкі.

Такім чынам, трансфармацыя аказіянальнай абраднасці ўяўляе сабой працэс істотнага змянення абрадавых элементаў пад уздзеяннем аб’ектыўных прычын, звязаных са значным уплывам на светапогляд чалавека. Паступовае адыходжанне традыцыйнага грамадства ад абрадавых норм і патрабаванняў з’явілася асноўнай прычынай трансфармацыі абрадавага комплексу. Гэты фактар меў вялікае значэнне і для аказіянальных абрадаў, змяненне якіх знаходзі-

лася ў непарыўнай сувязі са змяненнямі ўяўленняў чалавека пра навакольны свет.

ЛІТАРАТУРА


1. *Байбурин, А.К.* Ритуал в традиционной культуре / А.К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 240 с.
2. Беларускія народныя абрады / склад. і навук. рэд. Л.П. Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – 128 с.
3. Беларусы: у 8 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 1995. – Т. 5. Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 375 с.
4. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А.Ю. Лозка. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 534 с.
5. Дзіцячы фальклор / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Бел. нар. творчасць, 1972. – 734 с.
6. *Любимова, Г.В.* Способы борьбы с засухой в традиционной обрядности русских крестьян Западной Сибири / Гуманитарные науки в Сибири. Серия: Археология и этнография. № 3, 1997. [Электронный ресурс]. – 1997. – Режим доступа: http://x.archaeology.nsc.ru/Home/pub/Data/?html=gn9.htm&id=361. – Дата доступа: 02.05.2006.
7. *Сержпутоўскі, А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Выд. АН БССР, 1930. – 264 с.
8. Славянский и балканский фольклор: Верования. Текст. Ритуал / отв. ред. Н.И. Толстой. – М.: Наука, 1994. – 270 с.
9. *Толстые, Н.И. и С.М.* Заметки по славянскому язычеству: Вызывание дождя у колодца / Н.И. и С.М. Толстые // Русский фольклор. Поэтика русского фольклора. Т. XXI. – Л., Наука, 1981. – С. 87–98.
10. *Толстые, Н.И. и С.М.* Заметки по славянскому язычеству: Вызывание дождя в Полесье / Н.И. и С.М. Толстые // Славянский и балканский фольклор: Генезис. Архаика. Традиции / отв. ред. И.М. Шептунов. – М.: Наука, 1978. – С. 95–130.



SUMMARY

*The essences and the contents of transforming processes of Belarusian occasional ritual are considered. The principal objective causes (religion, socio-political factors, scientific achievements) which haste becomes the base of for alteration of the ritual complex are proved. Proceeding from the definition of the transformation as a natural process connecting with some changes of the people's life circumstances, the principal directions of the essential transformation of occasional rituals such as the change of the attribute instrument, functional tendency, the sphere of existence and the strengthening of dramatizer's, are defined.*


*УДК 821.131.1. Буццати*

***А.В. Ядловская,*** *аспирант кафедры русской и зарубежной литературы БГПУ*

# ЭКЗИСТЕНЦИАЛИСТСКИЕ МОТИВЫ В ТВОРЧЕСТВЕ ДИНО БУЦЦАТИ

Экзистенциализм проявил себя в европейской литературе во многом после Второй мировой войны в творчестве французских писателей Альберта Камю и Жан-Поля Сартра. Война явилась причиной того, что в творчестве многих европейских писателей стали подниматься проблемы человеческого существования, такие, как жизнь, смерть, тоска, беспокойство, грусть, печаль. В повести «Посторонний» А. Камю показал абсурдность человеческой жизни через призму внутренне опустошенного героя, в романе «Чума» – борьба мужественного героя с бессмысленной жизнью. Во многом на культуру XX века оказал влияние немецкий философ Мартин Хайдеггер, являющийся одним из основоположников немецкого экзистенциализма. В своих работах он развивал идею о бытии, в основе которого противопоставление подлинного существования и мира повседневности.

Но истоки экзистенциализма были заложены еще раньше, в XIX веке, датским философом Сереном Кьеркегором, который ввел понятие *экзистенции* как осознания внутреннего бытия человека в мире. Ясперс считает, чтобы прозреть экзистенцию как корень своего существа, человек должен оказаться в «пограничной ситуации», в момент глубочайшего потрясения. Определяя экзистенцию через ее конечность, экзистенциализм толкует последнюю как временность, точкой отсчета которой является смерть. Поэтому основными настроениями человека являются обреченность, раскаяние, безнадежность и страх. Поскольку предметное внешнее бытие выражает собой «неподлинное существование», обретение экзистенции предполагает решающий «экзистенциальный выбор», посредством которого человек переходит к истинному существованию. Через страх и выбор человек обнаруживает свою индивидуальность, поэтому страх и выбор представляют собой формы обнаружения свободы, которые неотделимы друг от друга [3].

Экзистенциализм как направление философии проявил себя и в Италии. Его представители – Никола Аббаньяно, Энцо Пачи. Во многом философия экзистенциализма оказала влияние на творчество итальянского писателя Дино